пы классицизма. В их числе каноничность, акцент на типических чертах, исключение индивидуального и случайного, утверждение разумного начала, служение государству и его интересам. В образах героев оперы-сериа, чаще всего заимствованных из античной мифологии, подчеркиваются их выдающиеся качества – сила, воля, благородство, преданность, верность долгу. Герой западноевропейской оперы является цельным, обобщенным, идеализированным типом, что обусловлено огромной ролью общественно-воспитательной функции искусства этой эпохи. Основными принципами в создании образа героя выступают условность, обобщенность и идеализация. При этом в произведениях таких мастеров оперного жанра, как Ж.-Б. Люлли, Г. Ф. Гендель, К. В. Глюк, образы героев выходят за рамки сложившихся канонов и приобретают психологическую глубину и реалистичность. В творчестве В. А. Моцарта складывается новый тип героя, обладающего индивидуальными музыкальными характеристиками и объединяющего в себе проявления высокого и низкого.

1. *Маркези, Г.* Опера. Путеводитель / Г. Маркези ; пер. с итал. Е. Гречановой. – М. : Музыка, 1990. – 383 с.

2. *Ферман, В. Э.* Оперный театр. Статьи и исследования / В. Э. Ферман. – М. : Гос. муз. изд-во, 1961. – 358 с.

3. *Челышев, П. В.* Человек античной мифологии: природа героя и личный выбор судьбы / П. В. Челышев // Вестн. КГУ. – 2014. – № 4. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/chelovek-antichnoy-mifologii-priroda-geroya-i-lichnyy-vybor-sudby (дата обращения: 08.04.2024).

УДК 7.097(476)

***У. А. Трапянок,***

*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕРАДАЧЫ «КАЛЫХАНКА» І «ДАБРАРАНАК» ЯК ПРЫКЛАД СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕТЭАТРА ПРАДУКЦЫЙНАГА ЎЗРОЎНЮ

**Анатацыя.** Прыводзяцца звесткі пра спецыфіку тэлетэатра, падаецца гісторыя тэлевізійнага тэатра Беларусі і вяшчання для дзіцячай аўдыторыі ў кантэксце развіцця нацыянальнага і савецкага тэлебачання.

Выяўлена колькасць тэатральнага кантэнту на сучасным беларускім тэлебачанні, адзінкавымі арыгінальнымі прыкладамі якога з’яўляюцца дзіцячыя перадачы «Калыханка» і «Дабраранак». Праведзены аналіз названых праектаў дазволіў аўтару артыкула аднесці іх да ўзораў тэлетэатра прадукцыйнага ўзроўню, для якога найперш характэрны сінтэз іґравога (тэатральнага) пачатку і тэхнічнай асновы тэлевяшчання.

**Ключавыя словы**: тэлебачанне, тэлетэатр, перадача для дзяцей, «Калыханка», «Дабраранак», тэлеканал «Беларусь 3», тэатр на экране.

***U. Trapianok,***
*PhD in Art History, Associate Professor of the Department of Direction of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts», Minsk, Belarus*

## CHILDREN'S PROGRAMS «KALYKHANKA» AND «DABRARANAK» AS AN EXAMPLE OF THE MODERN TELEVISION THEATER OF THE PRODUCTION LEVEL

**Abstract.** The article provides information about the specifics of television theatre, and also presents the history of Belarusian television theatre and broadcasting for children in the context of the development of domestic and Soviet television. The author identifies the volume of theatrical content on modern Belarusian television, the only original examples of which are the children's programs «Kalykhanka» and «Dabraranak». An analysis of these projects allowed the author of the article to classify them as examples of television theatre of a production level, which is primarily characterized by a synthesis of the acting (theatrical) principle and the technical basis of television broadcasting.

**Keywords:** television, television theater, program for children, «Kalykhanka», «Dabraranak», TV channel «Belarus 3», theater on the screen.

Тэлевізійны тэатр – гэта від тэатра, які сфарміраваўся і развіваецца ў сістэме тэлевяшчання. Спосабы ўзаемадзеяння аўдыявізуальнага сродку масавай камунікацыі з тэатрам утварылі трайную структуру, элементы якой прадугледжваюць трансляцыю на тэлебачанні (ТБ) існуючых сцэнічных работ, пры гэтым адзінства прасторы, у якой знаходзяцца акцёры і гледачы падчас тэатральнага дзейства, парушаецца (рэпрадукцыйны, ці рэтрансляцыйны, узровень тэлетэатра), адаптацыю ўзораў тэатральнай творчасці пад умовы экраннага мастацтва і стварэнне арыгінальных тэлеспектакляў (прадукцыйны, ці стваральны, узровень). Спецыфіка тэлевізійнага тэатра вызначаецца

найперш наяўнасцю ігравога пачатку і тэхнічнай асновы, пры гэтым, згодна з даследаваннямі Т. А. Марчанка, тэлетэатр валодае прынцыпам рэпартажнасці, які адпавядае псіхалагічнай устаноўцы, выпрацаванай у аўдыторыі дакументальным вяшчаннем і безумоўным успрыманнем асяроддзя тэлепраграм, і прынцыпам зносін, звязаным з камунікатыўнай прыродай ТБ, калі адбываюцца персаніфікацыя камунікатара і яго прамыя звароты да гледача [5, с. 125–126]. Акцёрская прырода ў тэлетэатры іншая, чым на сцэне – прынцып зносін выводзіць выканаўцу роляў тэлетэатра на першы (буйны) план з дамінантай на чалавечай сутнасці героя, пры гэтым сцэнаграфія і пластычны малюнак, распрацаваныя рэжысёрам, як бы знікаюць, адыходзяць на другі план, у выніку чаго тэатральнасць тэлеспектакля менш выразная, чым на традыцыйнай тэатральнай сцэне, але самадастатковая.

З’яўленне тэлетэатра Беларусі супадае з пачаткам нацыянальнага тэлевізійнага вяшчання ў 1956 г. Як пісала Н. А. Агафонава, адначасова аформіліся галоўныя ўзроўні структуры тэлетэатра – рэпрадукцыйны і прадукцыйны: нароўні з тыражыраваннем сцэнічных пастановак на тэлеэкране беларускі тэлетэатр засвоіў тэлеспектакль і тэлеперадачу пра тэатр як арыгінальныя формы [1, с. 11]. Актыўнае развіццё беларускага тэлетэатра з вызначальнай прадукцыйнай функцыяй, у выніку чаго запісана каля 250 арыгінальных мастацкіх тэлетвораў, прыпала на другую палову XX ст.

На мяжы стагоддзяў назіралася змяншэнне працэсаў стварэння тэлемастацтва, «мастацкае вяшчанне пачало імкліва арыентавацца выключна на забаўляльнасць» [2, с. 284], што прывяло да знікнення ў 1990-я гг. паняцця «тэлетэатр арыгінальнай формы». Месца папулярнага ў мінулым тэатральна-мастацкага кантэнту паступова занялі тэлесерыялы, «сіткомы», фільмы пераважна замежнай вытворчасці. Многія тэлеканалы, па словах М. А. Мясніковай, паставілі гледача ў сітуацыю «непарыўнага кінафільма» [6, с. 65], калі адзін фільм адразу змяняецца іншым, ці выбраны кінатвор трансліруецца па некалькі серый за дзень.

У сучаснай вяшчальнай палітыцы тэлеканалаў камерцыйны фактар пераважае над культурным. Праведзены намі аналіз зместу нацыянальных тэлеканалаў паказаў, што на сённяшні

дзень ніводны з іх, за выключэннем спецыялізаванага тэлеканала Белтэлерадыёкампаніі «Беларусь 3», не трансліруе тэатральны кантэнт. «Беларусь 3» спрабуе падтрымаць традыцыі тэлетэатра шляхам нешматлікіх рэтрансляцый спектакляў музычных і драматычных мінскіх тэатраў, а таксама стварае два штодзённыя пастановачныя праекты для дзіцячай аўдыторыі – «Калыханка» і «Дабраранак», якія, на нашу думку, можна аднесці да прыкладу сучаснага развіцця тэлетэатра арыгінальнага ўзроўню, паколькі яны ўтрымліваюць вызначальны іграві кампанент, спалучаюць элементы розных відаў тэатра (драматычнага, лялечнага) і цалкам адпавядаюць спецыфіцы тэлетэатра.

Станаўленне дзіцячага вяшчання Беларусі адбывалася ў кантэксце савецкага тэлевяшчання, якое было вызначальным для ўсіх рэдакцый рэспублік былога СССР. На тэрыторыі Савецкага Саюза дзіцячае вяшчанне з'явілася ў пачатку 1939 г., калі на Вопытным ленінградскім тэлецэнтры была створана і выдадзена ў эфір перадача «З новым годам!». У 1940 г. з паказу навагодняга спектакля «Зайкін дом» пачалося фарміраванне савецкага дзіцячага тэлетэатра прадукцыйнага ўзроўню, на рэтрансляцыйным узроўні перадаваліся прадстаўленні лялечных тэатраў пад кіраўніцтвам С. Абразцова і Я. Дэмені.

У 1951 г. была створана Цэнтральная студыя тэлебачання СССР [6, с. 25], у структуры якой дзейнічалі рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання і перадач для дзяцей. Задачамі вяшчання прадугледжваліся, у прыватнасці, трансляцыі тэатральных спектакляў пры ўмове «не пазней, чым праз месяц пасля прэм'еры» [7, с. 246], а таксама стварэнне дзіцячых праектаў. Знакавымі перадачамі савецкага ТБ для дзяцей сталі «Добрай ночы, малышы» і «АБВГДэйка». Праект «Добрай ночы, малышы» пачаў выходзіць з 1 верасня 1964 г. [6, с. 26], яго сённяшняя структура ўтрымлівае дзве часткі – у першай гучыць адрасаваны малым гледачам дыялог дарослага вядучага (вядучай) з лялечнымі героямі Хрушам, Сцяпашкам, Каркушай, Філем, другая частка прадугледжвае трансляцыю мультфільма. Выхад адукацыйнай пастановачнай тэлегульні для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту «АБВГДэйка» ажыццяўляўся з 1975 г. у форме іграваго спектакля, дзе ў ролях вучняў выступалі клоўны.

Дзіцячае вяшчанне ў эфіры беларускага (мінскага) тэлебачання стартавала з 1958 г. – праз два гады ад пачатку нацыя-

нальнага тэлевяшчання, стварэнне эфіру для дзяцей рэгламентавалася на дзяржаўным узроўні. У 1961 г. перад Камітэтам па тэлебачанні і радыёвяшчанні БССР была пастаўлена задача па арганізацыі штодзённага вяшчання для дзяцей хронаметражом да гадзіны. Перыядам росквіту дзейнасці дзіцячай рэдакцыі сталі 1980–1990-я гг., калі наладжваўся выпуск перадач «Тэлек-шоу», «Як нараджаецца музыка», «Зямля скарбаў», «Скрыня скарбаў» і інш. [3, с. 72–73]. У 1981 г. на беларускім тэлебачанні з'явілася перадача «Калыханка».

З-за змен канцэпцый нацыянальнага тэлевяшчання ў пачатку XXI ст. многія праекты для дзіцячай аўдыторыі закрыліся, іх месца занялі іншыя. Напрыклад, з 2003 г. на тэлеканале «СТБ» выходзіла перадача «Добры вечар, малыш», на тэлеканале «Лад» меліся «Пазакласная гадзіна», «Свая кампанія», «Наша пяцёрачка», «Бухта капітанаў» і перанесеная з вяшчальнай сеткі Першага тэлеканала «Калыханка» [3, с. 74]. У 2010-х гг. адбылося чарговае скарачэнне пастановачных тэлепраектаў для дзяцей, у выніку чаго засталася вячэрняя «Калыханка» тэлеканала «Беларусь 3».

«Калыханка» ствараецца згодна са спецыфікай дзіцячага ТБ, якая патрабуе большай, чым для дарослай аўдыторыі, прыцягальнасці, займальнасці, здольнай утрымаць увагу гледача, эмацыянальнасці, асаблівай мовы, зразумелай юнай аўдыторыі, адметнай пабудовы перадачы з унікальнымі героямі і яркім мастацкім афармленнем. Спачатку перадача выходзіла ад аднаго да трох разоў на тыдзень і будавалася на дыялогу вядучага дзядулі Бая ў выкананні рэжысёра галоўнай рэдакцыі музычных праграм Беларускага тэлебачання Б. Берцінга з лялечнымі сабачкам Цявам і хлопчыкам Бульбінкай (персанажаў агучвалі тагачасныя супрацоўнікі рэдакцыі ТБ). З першых дзён вяшчання ў праекце спалучыліся тэхналагічная аснова, падуладная тэлебачанню, і тэатральныя законы, якія дазволілі на сінтэзе сродкаў мастацкай выразнасці двух мастацтваў (тэатральнага і тэлевізійнага) стварыць праект-доўгажыхар для дзяцей.

На штодзённай аснове «Калыханка» пачала выходзіць з 1986 г., што пацягнула за сабой пошукі новых форм падачы матэрыялу і зместавай структуры. У розныя гады змяняўся дызайн студыі, з'яўляліся новыя героі, якіх увасаблялі дыктары, прафесійныя акцёры з выкарыстаннем лялек. Папулярнымі персанажамі некалькіх пакаленняў тэлегледачоў сталі, у пры-

ватнасці, лялечныя Дзед-Барадзед і птушаня Буслік, якое па-ранейшаму з'яўляецца на экране разам з іншымі лялечнымі героямі сённяшняй «Калыханкі» – мядзведзікам Топам, ліскай Янай і рысянём Рысяй. У сучасных выпусках тэлеперадачы бяруць удзел дзядуля Дабрадзей у выкананні прафесійнага акцёра В. Салаўёва, касмічная дзяўчынка Эліна і кемлівы хлопчык Данік [4]. Лялькі, якімі кіруюць прафесійныя акцёры мінскіх тэатраў, сярод іх – У. Варанкоў, Э. Пранскутэ і інш., выступаюць паўнапраўнымі героямі разыграных гісторый, яны знаёмяць малых беларусаў з разнастайнымі жыццёвымі сітуацыямі, з'явамі, фактамі, дэманструюць лепшыя якасці чалавека, выхоўваюць і павучаюць гледача праз гульні, уяўныя пераўтварэнні і фантазійныя перамяшчэнні. Сучасная «Калыханка» ствараецца па той жа структуры, што і «Добрай ночы, малышы» – першы ігравы блок (прадукцыйны ўзровень структуры тэлетэатра) змяняецца трансляцыяй мультфільмаў, выпушчаных, у тым ліку, на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» (рэпрадукцыя кінамастацтва).

Па аналогіі з перадачай «Калыханка», на сінтэзе дасягненняў мастацкага ігравога тэлевяшчання і законаў тэатральнай творчасці на тэлеканале «Беларусь 3» у ранішнім эфіры выходзіць дзіцячы праект «Дабраранак», вядучымі якога выступаюць лялечныя зайцы Кася і Лесік, якімі кіруюць прафесійныя акцёры, а таксама дзеці, што прывабліваюць да праграмы аўдыторыю такой жа ўзроставай катэгорыі. У форме размоў герояў гучыць пазнавальная інфармацыя, праводзяцца віктарыны, гульні, а таксама дэманструюцца мультыплікацыйныя фільмы.

Сцэнаграфічнае рашэнне праектаў «Калыханка» і «Дабраранак» вылучаецца яскравасцю колеравай гамы, наяўнасцю дэкарацыйных элементаў, якія падкрэсліваюць часавыя рамкі развіцця дзеянняў у перадачах – напрыклад, у «Калыханцы» фігуруюць месяц, ззяючыя зоркі; інтэр'ер студыі «Дабраранка» дапаўняюць паліцы з мноствам цацак, што нагадваюць дзіцячы садок. Прымененая графіка і гукавое афармленне праектаў дапаўняюць агульную атмасферу, створаную, у тым ліку, акцёрскай ігрой з інтанацыйнай выразнасцю, характэрнай для дзіцячых праектаў, ствараюць эфекты казачнасці, нечаканасці і дзівосаў (прынцып рэпартажнасці тэлетэатра). Тэлевізійны мантаж кадраў будуецца на чаргаванні планаў з акцэнтам на аднаго ці некалькіх герояў (прынцып зносін), на ўсю студый-

ную прастору, што падтрымлівае тэмпарытм перадач, уплывае на іх агульнае ўспрыняцце.

Такім чынам, тэлевізійныя перадачы «Калыханка» і «Дабранак» – гэта пастановачныя полісінтэтычныя праекты, што ўтрымліваюць элементы драматычнага і лялечнага тэатра, тэатралізаваную, разыграную гісторыю па арыгінальным сцэнарыі са скончаным у кожным выпуску сюжэтам, які можна назваць невялікім дзіцячым тэлеспектаклем (прадукцыйны ўзровень тэлетэатра), і скрыжоўваюцца з узорамі кінамастацтва – мультфільмамі. У падрыхтоўцы заняты прафесійныя акцёры, здольныя ярка ўвасобіць прапісаныя сцэнарыстамі вобразы, хутка ўключыцца ў прапанаваныя абставіны і паверыць у іх, каб эмацыянальна і праўдзіва паўздзейнічаць на самую патрабавальную аўдыторыю. Названыя перадачы працягваюць традыцыі пастановачнага тэлевяшчання Беларусі, з'яўляюцца адзінкавымі прыкладамі сучаснай мастацкай арыгінальнай вытворчасці, пабудаванай на ўзаемасувязях тэлебачання і тэатра, узорамі тэлетэатра прадукцыйнага ўзроўню.

1. *Агафонова, Н. А.* Телевизионный театр Беларуси: становление и тенденции развития : автореф. дис. ... канд. искусствоведения : 17.00.03 / Агафонова Наталья Анатольевна ; НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1992. – 20 с.

2. *Белоокая, М. А.* Художественное телевещание: традиции и современность / М. А. Белоокая // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (28–29 лістап. 2013 г., г. Мінск) : у 2 ч. / уклад. Н. С. Бункевіч [і інш.] ; гал. рэд. А. І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск, 2014. – Ч. 1. – С. 282–286.

3. *Борисевич, О.* Детское телевещание – дело государственной важности / О. Борисевич // Слова ў кантэксце часу: да 80-годдзя доктара філалагічных навук, прафесара Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча : зб. навук. прац / пад агул. рэд. В. І. Іўчанкава. – Мінск, 2009. – С. 72–81.

4. Калыханка // Беларусь 3. – URL: https://3belarus.by/be/shows/kalyhanka_(дата звароту: 30.05.2024).

5. *Марченко, Т. А.* Телевизионный театр. Истоки. Возможности. Специфика / Т. А. Марченко. – М. : Искусство, 1978. – 127 с.

6. *Мясникова, М. А.* Телевидение как феномен культуры : учеб. пособие / М. А. Мясникова. – 3-е изд., стер. – М. : ФЛИНТА ; Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2021. – 140 с.

7. Телевидение между искусством и массмедиа / ред.-сост. А. С. Вартанов. – М. : Гос. ин-т искусствознания, 2015. – 452 с.